**7 ліпеня - Сусветны Дзень беларускай культуры!**
**7th of July - the Global Day of Belarusian Culture!**

Нават жывучы далёка ад родных мясцінаў, мы застаемся беларусамі. Шануем нашы святы, адзначаем іх песнямі ды танцамі, але разам з тым адчуваем патрэбу ствараць новыя традыцыі і завядзёнкі. Ладзіць Дні беларускай культуры — адна з іх. Вось ужо трэці год гэтае свята яднае тысячы беларусаў. І чарговы раз сцвярджае тэзу: Беларусь там, дзе беларусы!

Слоганам глабальнай кампаніі #ByCultureGlobal23, якая пройдзе ў ліпені 2023, стануць словы **"Расказаць Беларусь"** (Speak Belarus).

У нас ёсць патрэба не проста захоўваць сваю нацыянальную самасць у любой краіне, але і ганарыцца сабой, і гучна казаць пра сябе свету. Казаць не толькі пра свой боль і горыч, але і пра тое, якія мы, годныя беларусы, якая яна, Беларусь, што існуе ў нашых сэрцах, думках і памкненнях і якой яна можа стаць у будучыні.

Назва "Беларусь" раз-пораз з'яўляецца ў сусветных СМІ, але гэтая згадка ў большасці выпадкаў звязаная са словамі "Лукашэнка", "дыктатура", "ракеты", "мігранты на мяжы". Гэта ўсё — не пра нас.

Дзейныя, актыўныя беларусы засноўваюць выдавецтвы і выпускаюць кнігі на беларускай мове, ставяць спектаклі, якія збіраюць аншлагі на сусветна вядомых пляцоўках, адкрываюць беларускія школы і ствараюць кантэнт на беларускай мове, спяваюць беларускія песні і танцуюць народныя танцы.

Разам з тым беларусы шануюць традыцыі і культуру тых мясцінаў, дзе жывуць, а праявы беларускай культуры пастумова інтэгруюцца ў лакальны культурніцкі кантэкст.

Беларусы могуць згуртавацца вакол яскравага, жыццядайнага і сонечнага нацыянальнага свята Купалле, вакол асобаў слаўных землякоў Янкі Купалы, Яна Чачота і Марка Шагала, якія нарадзіліся 7 ліпеня. Таму менавіта 7 ліпеня — цэнтральная дата, Сусветны Дзень беларускай культуры.

**Такім чынам, "Расказаць Беларусь" — гэта:**

- расказваць пра саміх беларусаў, чым мы жывём сёння, якія мы, як наша беларускасць існуе ва ўмовах неверагодных рэпрэсій, ціску, засілля расейскай культуры (у Беларусі) і адарванасці ад роднай зямлі (калі гаворка пра беларусаў замежжа);
- мовай мастацтва казаць пра нашых палітвязняў;
- казаць пра мінуўшчыну і выбітных персон нашай гісторыі, легендарныя падзеі;
- казаць пра нацыянальныя традыцыі і наш багаты жывы фальклор;
- расказваць пра здабыткі беларускіх творцаў, найлепшыя ўзоры творчасці ў розных жанрах мастацтва (умоўна, нацыянальны беларускі канон);
- расказваць пра тое, чым мы ганарымся, у чым ёсць нашая годнасць і што адрознівае нас ад іншых нацый.

Сёння беларускі народ перажывае ўнікальны перыяд: мы паказалі свету і штодзень працягваем даказваць, што беларусы без спрыяння сваёй дзяржавы, без стабільнай фінансавай падтрымкі з боку ўмоўнага мінкульту здольныя сцвярджаць сваю самасць. Мы захоўваем прыхільнасць да сваёй унікальнай культуры, а беларуская мова, як бы парадаксальна гэта ні гучала, перажывае рэнесанс папулярнасці.

Свет мусіць ведаць, кім мы ёсць. Даведвацца пра нас — праз нашыя культуру, мастацтва, мову беларусаў.

**Фарматы святкавання Дзён культуры (можна дапаўняць)**

- сабраць сяброў на прагляд беларускага кіно ці арганізаваць чытку беларускай п’есы
- зладзіць канцэрт, выставу, чытанне беларускіх вершаў, спеўна-танцавальную вечарыну;
- усталяваць нацыянальны беларускі сцяг у двары (вывесіць у акне);
- прыгатаваць любімую беларускую страву і паклікаць суседзяў на пачастунак;
- зрабіць у сацсетцы пост (серыю пастоў) па-беларуску з хэштэгам свята #SpeakBelarus;
- сустрэцца з сябрамі ці зладзіць вечарыну для дыяспары: прыгатаваць беларускія традыцыйныя і сучасныя (аўтарскія справы), спяваць беларускія песні, танчыць беларускія танцы;
- зладзіць беларускі пікнік разам з сябрамі і прыяцелямі іншых нацыянальнасцяў;
- адзець беларускі строй, сплесці вянок, узяць у рукі кветкі ды выправіцца на доўгі шпацыр па горадзе з крэатыўнымі постарамі і бел-чырвона-белымі сцягамі
- ускласці кветкі да помнікаў беларускім дзеячам культуры, наведаць месцы пахавання знакамітых беларусаў;
- адсвяткаваць Купалле, намаляваць уласную папараць-кветку і загадаць галоўнае жаданне;
- даслаць карысную інфу ці спасылкі на драйвовы кантэнт пра Беларусь і беларусаў сваім замежным сябрам;
- арганізуючы онлайн ці афлайн-івэнты, асвятляючы гэтыя падзеі, праматуючы святкаванне публічна, выкарыстоўваць фірмовы брэндбук *SpeakBELARUS*
- паўдзельнічаць у онлайн-флэшмобе 7 ліпеня (будзе адноўлена пазней)